# ЯКІЯ ДЫЯМЕНТЫ СХАВАНЫЯ Ў «НАЦЫЯНАЛЦЫ»?

## Пяць цікавостак новай выстаўкі

**Да свайго стагадовага юбілею Нацыянальная бібліятэка падрыхтавала шэраг сюрпрызаў. Тут ладзяцца выстаўкі, круглыя сталы, майстар-класы, цікавыя сустрэчы. Падчас такіх мерапрыемстваў бібліятэка пакрысе раскрывае свае сакрэты. Так, у музеі кнігі праходзіць выстаўка, прысвечаная рарытэтам. Тут прадстаўлены найбольш старажытныя кнігі і рукапісы. А днямі адкрылася новая экспазіцыя «Дыяменты стагоддзя: з бібліятэчнай калекцыі», якая знаёміць з навейшымі ўзорамі кнігадрукавання — як айчыннага, так і сусветнага — з 1922-га да 2022 года.**




Сёння фонд Нацыянальнай бібліятэкі — звыш 10 мільёнаў экзэмпляраў, і ён прырастае на 200 тысяч дакументаў. Арыентавацца ў гэтых інфармацыйных скарбах няпроста. І новая выстаўка якраз дапаможа даведацца пра найбольш цікавыя кнігі, якія на працягу стагоддзя былі самымі запатрабаванымі ў чытачоў. У экспазіцыі прадстаўлены літаратурныя бестселеры, кнігі, адзначаныя на конкурсах. Напрыклад, першыя выданні твораў сусветнай класікі.



### 1. Даступныя рарытэты

У экспазіцыі пададзены факсімільныя выданні Тураўскага і Слуцкага Евангелляў, кнігі першадрукара Францыска Скарыны, Жыцце Еўфрасінні Полацкай і першы ў свеце буквар. Арыгінал апошняга захоўваецца ў Лонданскай бібліятэцы, але дзякуючы выдавецкай рабоце «нацыяналкі» сёння такія якасныя копіі старых каштоўных выданняў даступныя чытачам. Таксама прадстаўлены факсімільныя зборнікі класікаў беларускай літаратуры.

### 2. Кніжкі-малышкі

На выставе можна пабачыць калекцыю мініяцюрных кніжак (памер не перавышае 10 сантыметраў). Дарэчы, сярод самых першых мініяцюрных выданняў — справаздача з дзяржынскай раённай партканферэнцыі 1930 года. У 1960-х кніжкі-малышкі становяцца папулярнымі. На выстаўцы можна пабачыць, напрыклад, такі зборнік вершаў Якуба Коласа.

### 3. Сваімі рукамі

Выстаўка падкажа, якія выданні былі папулярнымі ў розныя дзесяцігоддзі. Статыстычныя звесткі падказваюць, што ў 1960—1970-я гады чыталі кнігі Івана Чыгрынава, Івана Шамякіна, Івана Мележа. Некаторыя творы друкаваліся ў часопісах. Бібліятэкары могуць згадаць, які быў ажыятаж на нумары, у якіх друкаваліся творы Караткевіча. На выстаўцы можна ўбачыць рукатворную кнігу з раманам «Чорны замак Альшанскі» — сабраную з надрукаваных у часопісах старонак.




### 4. Часопісы

У фондах бібліятэкі багата перыядычных выданняў. Напрыклад, захоўваецца тэхналагічны часопіс, які выйшаў у свет у 1804 годзе, выданні, якія друкуюцца з XIX стагоддзя да нашага часу, ужо паступіў у фонд свежы нумар часопіса «Вакол свету», а самы стары – з тых, што ёсць у бібліятэцы, — 1861 года.

Арганізатары абралі для экспазіцыі нумары, якія выходзілі з 1920-х гадоў мінулага стагоддзя. А каб прасачыць, як мянялася афармленне выдання, побач змясцілі іх сучасныя варыянты. Так можна пабачыць, якімі раней былі часопісы «Бярозка», «Алеся», «Беларусь», National Geographic, Popular Science і іншыя. Сярод цікавостак — часопіс «Трыбуна мастацтва», які ў 1925 годзе выходзіў на чатырох мовах (на той час дзяржаўнымі ў беларускай рэспубліцы былі беларуская, руская, польская і яўрэйская). Заслугоўвае ўвагі і нумар «Маладога аратага», дзе змешчаны партрэт нашага першадрукара і частка тэксту, надрукаваная шрыфтам Скарыны.

### 5. Сведкі эпохі.

Карты, графіка, плакаты, календары, аўтарэфераты і дысертацыі, нотныя дакументы, аўдыявідэаносьбіты (пласцінкі, магнітныя стужкі, дыскі) таксама захоўваюцца ў фондах бібліятэкі і прадстаўлены ў экспазіцыі. Тут можна пабачыць нават рэдкія каляровыя пласцінкі, паслухаць сусветную класіку.

Літаратурны музей прадставілі для выстаўкі рэчы, што належалі пісьменнікам, сярод якіх чытацкія білеты, асадкі, закладкі, машынкадрукарка Рыгора Барадуліна, настольная лямпа Янкі Брыля, партфель Петруся Броўкі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**